©Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа

***Саўчук Т. В.****, настаўніца пачатковых класаў Раснянскай сярэдняй школы Камянецкага раёна*

# Пяць падказак. Знакамітыя беларусы

Пяць падказак. Знакамітыя беларусы» — гэта інтэрактыўная гульня, у якой навучэнцы па чарзе атрымліваюць 5 падказак, каб адгадаць, пра якога вядомага чалавека або гістарычную асобу ідзе гаворка. Кожная падказка ўяўляе сабой факт або характарыстыку, якая адносіцца да дадзенай асобы.

**Мэта гульні:** развіваць цікавасць да пазнавальнай дзейнасці, фарміраваць маральныя каштоўнасці, павагу да культурнай спадчыны і патрыятычнае выхаванне; развіваць лагічнае і крытычнае мысленне, уменне аналізаваць і абагульняць інфармацыю, ўсталёўваць прычынна-выніковыя сувязі, фарміраваць даследчыя навыкі; пашыраць, паглыбляць і замацоўваць веды аб знакамітых беларускіх гістарычных дзеячах.

**Правілы гульні:**

1. Вядучы гульні (настаўнік) зачытвае першую падказку.
2. Вучні абмяркоўваюць магчымыя адказы і дзеляцца сваімі здагадкамі.
3. Калі ніхто не адгадвае, вядучы зачытвае наступную падказку.
4. Працэс паўтараецца, пакуль не будуць выкарыстаныя ўсе 5 падказак ці хтосьці не адкажа правільна.
5. Перамагае той, хто першым правільна адгадае асобу.

Дадатковы матэрыял уяўляе сабой відэа і інтэрактыўныя заданні па адпаведнай тэме.